# Выстаўка, прысвечаная Дню друку

У Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна адкрылася выстаўка, прысвечаная Дню бальшавіцкага друку. На стэндах экспаніруюцца газеты, часопісы, брашуры, кнігі, выданыя на рускай і беларускай мовах. На першым стэндзе прадстаўлены творы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. У спецыяльным раздзеле выстаўлены зборнікі і брашуры з артыкуламі В. І. Леніна І. В. Сталіна, М. І. Калініна, С. М. Кірава аб бальшавіцкім друку.

На выстаўцы экспаніруюцца першыя нумары газет «Искра», «Вперед», «Пролетарий», «Правда», выданыя ў перыяд 1902—1912 гадоў. Вялікую цікавасць прадстаўляе раздзел «Партызанскі друк БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны». На стэндах дэманструюцца загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І. В. Сталіна, лістоўкі, газеты, якія выдаваліся ў падполлі. Тут-жа экспаніруюцца некалькі нумароў партызанскага сатырычнага часопіса «Раздавім фашысцкую гадзіну».

На асобным стэндзе прадстаўлены кнігі, выданыя пасля вайны. Толькі ў 1949 годзе Беларускае дзяржаўнае выдавецтва выпусціла 356 назваў розных кніг агульным тыражом 8.099 тысяч экземпляраў. На выстаўцы экспаніруецца многа твораў палітычнай, мастацкай, дзіцячай літаратуры. На спецыяльных стэндах выстаўлены кнігі знатных стаханаўцаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

(БЕЛТА).